# Арыентуемся ў быце

**Сацыяльна-бытавая арыенціроўка ў інтэграваным навучанні і выхаванні нараўне з іншымі вучэбнымі прадметамі адыгрывае важную ролю ў развіцці сацыяльна-бытавых уменняў і навыкаў у дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Вялікае значэнне ў павышэнні актыўнасці навучэнцаў мае правільна арганізаваная дзейнасць. Практыка паказвае, што прымяненне сацыяльных сродкаў, новых метадаў і прыёмаў палягчае разуменне навучэнцамі матэрыялу, які вывучаецца.**

Для таго каб павысіць эфектыўнасць адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце "Сацыяльна-бытавая арыенціроўка", мной быў створаны электронны дадатак "Сацыяльна-бытавая арыенціроўка. 3 клас" для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з мэтай індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі адукацыйнага працэсу. Распрацоўка выйшла ў фінал Рэспубліканскага конкурсу "Камп'ютар. Адукацыя. Інтэрнэт".

Гэты электронны дадатак ахоплівае ўсе раздзелы вучэбнай праграмы па прадмеце "Сацыяльна-бытавая арыенціроўка" ў 3 класе: "Асабістая гігіена", "Адзенне. Абутак", "Харчаванне", "Вуліца. Транспарт", "Жыллё", "Прадпрыемства. Установа", а таксама накіраваны на замацаванне і практычнае прымяненне атрыманых навучэнцамі ведаў з улікам іх індывідуальных магчымасцей. Праект можна выкарыстоўваць і пры правядзенні вучэбных заняткаў па прадмеце "Чалавек і свет" (2 клас), факультатыўных заняткаў "Здаровы лад жыцця" (1 клас) ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Раздзелы ўключаюць у сябе заданні тэарэтычнага і практычнага характару, рознага ўзроўню складанасці.

Разгледзім больш падрабязна тэму "Догляд рук і ног". Па гэтай тэме навучэнцам прапануецца 6 заданняў. Так, у першым заданні школьнікам неабходна ўважліва паслухаць расказ персанажа пра тое, што спатрэбіцца для догляду рук і ног. На экране з'яўляюцца выявы прадметаў і іх апісанне. Другое заданне дае магчымасць візуальна замацаваць атрыманыя веды. Навучэнцам неабходна суаднесці прадмет і яго цень. Калі дзіця памыляецца, персанаж прапануе паспрабаваць яшчэ раз. Яшчэ адно з прадстаўленых заданняў спрыяе замацаванню вывучанага матэрыялу. На экране паказваюцца прадметы, неабходныя для мыцця рук і ног. Навучэнцы збіраюць з рассыпаных літар назвы гэтых прадметаў. Дадзенае заданне накіравана не толькі на развіццё сацыяльна-бытавой арыенціроўкі, але і на паўтарэнне дыферэнцыяцыі галосных і зычных гукаў.

Пры прымяненні электроннага дадатку на вучэбных занятках "Сацыяльна-бытавая арыенціроўка" адзначыла, што ў навучэнцаў павысілася цікавасць да прадмета, скараціўся час для фарміравання ведаў, уменняў і набыцця практычных навыкаў па раздзелах, якія вывучаюцца, актывізавалася пазнавальная дзейнасць навучэнцаў і самастойная работа на вучэбных занятках.

Электронны дадатак створаны з дапамогай праграм: Visual Studio-2017, Adobe Illustrator, Spriter, Audacity. Таксама створана анлайн-версія дадатку, даступная для ўсіх па спасылцы: *https://learningapps.org/watch?v=p8cwdzuh219.* Усе кампаненты дадатку аўтарскія.

**Святлана ПЛАТАНОВІЧ,
настаўнік-дэфектолаг
сярэдняй школы № 2 Смаргоні
Гродзенскай вобласці.**